Працаўнікі ААТ «Парахонскае», чые імёны заносіліся на Дошку гонару прадпрыемства (па выніках работы за 2017 і 2018 гады):

ЖЫЛІНСКІ Мікалай Васільевіч, намеснік дырэктара па вытворчасці.
МЕЛЬНІК Валянціна Рыгораўна, аператар машыннага даення МТК № 1.
НАВУМОВІЧ Вера Іванаўна, аператар машыннага даення МТК № 2.
МАЛАЙЧУК Юлія Аляксандраўна, жывёлавод па доглядзе цялят.
ДАЎНАТОВІЧ Марына Георгіеўна, намеснік начальніка МТК № 2.
НАВАРЫЧ Мікалай Мацвеевіч, бетоншчык.
КРАВЕЦ Вячаслаў Мікалаевіч, начальнік вытворчага ўчастка.
ЕЎТУХ Ніна Мікалаеўна, повар.
КІРЫКОВІЧ Вячаслаў Мікалаевіч, кіроўца аўтамабіля.
ЛЫСЮК Аляксандр Віктаравіч, кіроўца аўтамабіля.
ПЕКУН Дзмітрый Мікалаевіч, трактарыст-машыніст.
СІДАРЭВІЧ Лілія Леанідаўна, бухгалтар.
ЖАРУН Марына Лявонцьеўна, галоўны эканаміст.
МІНЬКО Алішэр, начальнік МТК № 1.
ЧЭЧУН Кацярына Міхайлаўна, аператар машыннага даення МТК № 2.
ГРЫШКО Сяргей Дзмітрыевіч, жывёлавод КДіО аддзялення № 1.
ПАКАЛЮК Аляксандр Аляксандравіч, цясляр-бетоншчык.
РАМАНОВІЧ Марыя Захараўна, вагаўшчык.
СЛУЦКІ Ілья Рыгоравіч, інжынер-механік.
ЧЭЧУН Алена Фёдараўна, прадавец.
КАВАЛЕВІЧ Сяргей Міхайлавіч, кіроўца аўтамабіля.
ТРУШ Уладзімір Пятровіч, кіроўца аўтамабіля.
МАЛЫШЧЫЦКІ Алег Мікалаевіч, трактарыст-машыніст.
САШНЯНІН Уладзімір Уладзіміравіч, трактарыст-машыніст.
МАЦУКЕВІЧ Дзяніс Іванавіч, галоўны энергетык.

Імёны лепшых за 2019 год будуць названы ў сакавіку, пасля агульнага сходу акцыянераў, які пройдзе ў канцы лютага.

Тут размешчаны біягазавыя ўстаноўкі па вытворчасці ўласнай цеплавой і электраэнергіі.

Загадчык рамонтна-механічнай майстэрні № 2 Ігар ПАЛЕЙ аглядае новую ўборачную тэхніку, закупленую да чарговага сезона.

Аператар біягазавай установкі Ігар ЯСЮКОВІЧ.

– Каторы раз да вас прыязджаем, Уладзімір Фёдаравіч, і пастаянна бачым адно – суцэльную новабудоўлю.

– Хочаш развівацца – будуйся, правіла простае. Таму трымаем уласную брыгаду будаўнікоў, якая налічвае 60 чалавек і «ўзброена» фактычна поўным наборам спецыяльнай тэхнікі і абсталявання. І я, і мае спецыялісты з самага пачатку будавалі для сябе. Было і так, што вечарам і ноччу мы са спецыялістамі вось за гэтым сталом малявалі сваё бачанне, а раніцай будаўнікі пачыналі ўзводзіць сцены. А следам за імі праекціроўшчыкі распрацоўвалі на паперы праект. Інакш не паспявалі. На той момант мы ўзялі найлепшыя ідэі з таго, што было ў Беларусі. Я цалкам абапіраюся ў рабоце на сваіх галоўных спецыялістаў, гэта сур'ёзныя людзі, дасведчаныя спецыялісты, кожны ў сваёй галіне, па-добраму амбіцыйныя. Узровень заработнай платы дазваляе ім мець сур'ёзны даход, і кожны працуе з поўнай аддачай, мяне гэта радуе.

Спецыялісты наогул падабраліся нармальныя. Стараемся іх належным чынам вучыць. Без перабольшвання можна сказаць, што за апошнія гады яны ўбачылі ўвесь свет. Не толькі Еўропу, але і Амерыку, і Канаду. І кожны раз прывозяць нешта новае. Шмат навінак тэхналогіі прывезлі з Галандыі і Ізраіля.

Сёлета зробім сабе падарунак да Дня Незалежнасці – пусцім новы комплекс, дзе будзе шмат тэхналагічных навінак, прывезеных спецыялістамі з замежных камандзіровак.

У прынцыпе, я 2019 годам задаволены, і ў будаўніцтве таксама, бо ўсё задуманае зрабілі. Ці амаль усё. Пакуль хіба не паспелі завяршыць сучасныя майстэрні для шыроказахопнай тэхнікі, каб і тут людзі маглі працаваць у цяпле і ўтульнасці. Тыя майстэрні, што ёсць, – яны таксама нармальныя, але шыроказахопнай тэхніцы цеснавата. А так у гаспадарцы ўсё ёсць, у тым ліку стацыянарная бензазапраўка, чатыры бензавозы, тэхніку запраўляем у полі.

Дырэктар ААТ «Парахонскае» Уладзімір ХРАЛЕНКА сярод будаўнікоў новага комплексу.

Дарэчы, летась купілі новы бензавоз і тыя чатыры камбайны, пра якія я ўспамінаў, два малакавозы, два трактары, іншую тэхніку. Бяром яе пад наяўных людзей. Узяў тэхніку – яна павінна працаваць. Узяць і паставіць пад плот – няправільна.

– І ўсё ж – ці існуе дэфіцыт кадраў у паспяховай гаспадарцы, як некалі?

– Пакаленне, якое прыехала сюды ў 1975 годзе, цяпер штомесяц сыходзіць на пенсію. І мы штомесяц запрашаем на работу механізатараў. Я і сёння ўзяў бы чалавек 20 механізатараў, у тым ліку шафёраў, бо тэхнікі дабаўляецца і ўмелыя рабочыя рукі патрэбны.

Сёлета дае сябе адчуць і пэўны недахоп даярак, прычына – больш чым уважлівая: адразу 35 жанчын у дэкрэце. Дзякуючы такой іх актыўнасці дзетак у нас многа. Больш чым на дзве з паловай тысячы насельніцтва (калі дакладней, то 2767) на тэрыторыі сельсавета ў пачатку новага года налічвалася 540 дзяцей. На іх вельмі спадзяёмся. Падрастуць – падставяць плячо роднай гаспадарцы.

А пакуль сёння 50 прадстаўнікоў розных спецыяльнасцяў возім з горада, за 25 кіламетраў. Ёсць перавозкі і ўнутры гаспадаркі, за 16 кіламетраў, тых жа даярак – гэта ўжо спецыфіка буйнатаварнай вытворчасці: жывёлагадоўчыя комплексы размешчаны ў адным месцы, а вёскі могуць быць і ў іншым. Вы пыталіся пра ўмовы працы. Дык вось, рэжым работы даярак – праз дзень, плюс выхадны. У фермах — чысціня і парадак, выконваюцца патрабаванні санітарыі і гігіены, людзям дапамагае аўтаматыка. Стараемся падтрымліваць парадак паўсюдна, бо няма парадку – няма тэхналогіі.

– Ці лёгка вам сёння жывецца ў акружэнні трох рэк, на былых тарфяніках?

– Існуе пастаянная неабходнасць у працягу меліярацыйнага паляпшэння зямель і рамонце дзеючай сістэмы. Тарфянік пасля больш-менш працяглага выкарыстання паступова зношваецца. Тады ў засушлівыя перыяды пачынаюцца тарфяныя буры. Варта браць пад увагу і той факт, што меліярацыйныя збудаванні паступова старэюць, пачынаецца заіленне і сістэмы трэба пастаянна паднаўляць. Ёсць і такая з'ява, як зарастанне меліярацыйных каналаў. Таму давялося за сур'ёзныя грошы набыць галандскі агрэгат, які ачышчае каналы ад расліннасці. У сваю чаргу, два экскаватары падчышчаюць дно, дзе ёсць перашкода вадзе. Працуюць бульдозеры, касілкі. А ўвогуле падтрыманне меліярацыйнай сістэмы ў належным парадку патрабуе затрат. Мы жывём у такой зоне, дзе і засуха для нас – бяда, і залішняя вільгаць таксама. У маі мінулага года за адзін дзень выпала амаль месячная норма ападкаў. Гэта быў экзамен для сістэмы.

– Далейшыя перспектывы гаспадаркі вы звязваеце з развіццём тых галін, што ўжо ўмацаваліся, ці выношваеце нейкія новыя планы?

– Няма мяжы ў дасканаласці. Мы павінны дабіцца, каб былі стабільныя 1 кілаграм 200 грамаў – паўтара кілаграма прываг, і надоі тысяч дзевяць малака на карову. Тады, я лічу, гэта дазволіць бязбедна жыць і развівацца.

Пасля гутаркі Уладзімір Фёдаравіч, як і мінулыя разы, павёз журналістаў па гаспадарцы, паказаў новыя, заселеныя жывёлай карпусы і тыя, што яшчэ будуюцца. Звярнуў нашу ўвагу на новыя дарогі, пазнаёміў з людзьмі. І шчодра дзяліўся з намі планамі на блізкую і больш аддаленую перспектыву. Мы слухалі і абсалютна шчыра верылі, што ўсе гэтыя планы грунтуюцца на дакладным гаспадарчым разліку, веданні жыцця і на веры ў людзей, якія ўсе разам і ёсць адкрытае акцыянернае таварыства (зробім акцэнт на слове таварыства) «Парахонскае». А таму яны цалкам рэальныя.

Кармы для вялікага статка ў гаспадарцы нарыхтоўваюць і захоўваюць па самых сучасных тэхналогіях. На гэтых фотаздымках вы бачыце камбікормавы завод, а таксама ўстаноўку для апрацоўкі алейных культур. За яе дзейнасцю назірае аператар Юрый ЗЕЛЬМАН.

«Гэты рэгіён павінен жыць і квітнець»

Размову пра сацыяльны пакет для парахонцаў, аб якім гаварыў дырэктар, мы працягваем са старшынёй прафсаюзнага камітэта Людмілай МАЛЫШЧЫЦКАЙ.

– У сацыяльны пакет таксама ўваходзіць матэрыяльная дапамога да адпачынку – палова ад сярэднемесячнай заработнай платы. Згодна з калектыўным дагаворам ёсць выплаты пры ўступленні ў шлюб упершыню, калі маладыя людзі адпрацавалі ў гаспадарцы не менш за год. Да 23 лютага робяцца выплаты мужчынам, да 8 сакавіка – жанчынам. І ўсім працаўнікам да прафесійнага свята. А яшчэ пры нараджэнні дзіцяці. І калі чалавек доўгі час хварэе (два месяцы і больш) альбо здараюцца сумныя падзеі, таксама аказваецца дапамога. Прычым у некаторых выпадках выплаты ідуць ад дырэкцыі і ад прафкама.

На новай вуліцы гаспадаркі.

Пры выхадзе ветэрана працы на пенсію выплачваецца матэрыяльная дапамога ў залежнасці ад стажу працы ў гаспадарцы. Нядаўна дапоўнілі калектыўны дагавор цікавым пунктам, згодна з якім работнікам, што на момант дасягнення пенсійнага ўзросту адпрацавалі на нашым прадпрыемстве працяглы тэрмін – жанчыны 30, а мужчыны 35 гадоў – штомесячна будзе налічвацца пасля выхаду на пенсію матэрыяльная дапамога ў памеры трох базавых велічынь. Ёсць выплаты ў сувязі з 50-гадовым юбілеем.

Працуе камісія па аздараўленні. Пуцёўкі на курортна-санаторнае лячэнне дзецям нашых работнікаў бясплатныя. Калі гэта пуцёўка «Мама і дзіця», то дзіця едзе бясплатна, з мамы ўтрымліваецца 15 працэнтаў кошту пуцёўкі. Дарослыя адпачываюць за 30 працэнтаў кошту.

Аказваем дапамогу дзіцячаму садку, школе, у тым ліку школам і садкам далучаных да нас вёсак Камень і Пагост-Загародскі, музычнай школе, Дому культуры, царкве і іншым сацыяльным аб'ектам. Уладзімір Фёдаравіч нікому не адмаўляе, хто звяртаецца. Усе сацыяльныя аб'екты, што на нашай тэрыторыі, атрымліваюць ад гаспадаркі дапамогу. Гэты рэгіён павінен жыць і квітнець, лічыць дырэктар, і мы з ім згодны.

У тым ліку гаспадарка сур'ёзна падтрымлівае бальніцу. Там працуюць тры дактары, стаматолаг, штат медсясцёр. Ёсць стацыянар і паліклініка, аптэка. Нашы медыкі выконваюць усе працэдуры, як звычайна ў бальніцы. Дастунасць медыцынскай дапамогі – вось што галоўнае. Асабліва гэта дапамагае жыць нашым пенсіянерам.

Пад зоркай паэта

– Радуе нас наша школа, – працягвае свой расказ Людміла Аляксандраўна. – Тут вучыцца 315 хлопчыкаў і дзяўчынак; педагогаў 40 чалавек, яшчэ 20 хоць лічацца абслугоўваючым персаналам, але ж, па сутнасці, – хіба не педагогі?

Школа ўдала выкарыстоўвае станоўчы ўплыў соцыуму на выхаванне і культурнае развіццё вучняў, актыўна супрацоўнічае з гаспадаркай, дзе працуюць бацькі. Вучацца дзеці нармальна, таму ўпэўнена адчуваюць сябе на раённых навукова-практычных канферэнцыях. Зусім нядаўна ў абласным цэнтры прайшоў міжнародны шматжанравы конкурс-фестываль «Белавежская зорка», і вучні прывезлі дыпломы лаўрэатаў 1-й ступені. Прывозяць узнагароды і з круглагадовых раённых спартакіяд устаноў адукацыі.

Слухаем Людмілу Аляксандраўну і думаем: а вось цікава, якімі атрымаюцца сачыненні надзвычай развітых і сапраўды таленавітых дзяцей мясцовай школы, калі ім здагадаюцца задаць тэму: «Што сказаў бы пра сучаснае Парахонскае Аляксандр Блок?» Шырока вядомы факт: паэт з сусветным імем бываў у Парахонску і яго ваколіцах падчас імперыялістычнай вайны, калі праходзіў службу ў інжынерных часцях. Меў у падначаленні дзве тысячы будаўнікоў і ўзводзіў фартыфікацыйныя збудаванні, а жыў у сядзібе мясцовага памешчыка князя І. Э. Друцкага-Любяцкога.

– Асобна варта падкрэсліць, што поспех школы ў пэўнай ступені закладваецца ў нашым дзіцячым садку. Чаргі ў яслі-сад няма, дзетак прымаем па першым звароце бацькоў. Дарэчы, у аграгарадку Парахонск захоўваецца стабільная нараджальнасць – 25–30 дзетак у год. У яслях-садку для адаптацыі навічкоў працуе група кароткачасовага знаходжання, якую самыя маленькія гадаванцы наведваюць разам з бацькамі. Яшчэ што цікава: у групах абсталяваны міні-агароды і міні-сядзібы, там дзеці атрымліваюць урокі эмацыянальных узаемаадносін з жывой прыродай, вучацца даглядаць расліны.

– Людміла Аляксандраўна, з мінулых разоў ведаем, што ў вас надзвычай паспяхова працуе і дзяржаўная дзіцячая школа мастацтваў.

– Так, я заўсёды з замілаваннем гляджу, як сюды спяшаюцца на заняткі сюды дзеці з футлярамі для музычных інструментаў за спінай. Адразу 125 дзетак авалодваюць навыкамі ігры на скрыпцы, баяне, акардэоне, на фартэпіяна і духавых музычных інструментах. У нас няма праблемы арганізаваць канцэрт на святы, бо выступаюць не толькі запрошаныя вядомыя артысты і выканаўцы, але і – вельмі ахвотна – нашы дзеці. І слухаюць іх не горш за праслаўленыя калектывы, а апладзіруюць мо яшчэ і лепш – свае ж таленты! Пра тое, што таленты, сведчыць такі факт: па выніках работы наша дзіцячая школа мастацтваў станавілася пераможцам раённага спаборніцтва сярод музычных школ у 2011, 2013, 2016, 2017 гадах. А ў 2018 годзе занесена на раённую Дошку гонару.

Узорны ансамбль народнай музыкі «Красачкі», які складаецца з вакальнай і аркестравай груп, удзельнічаў у Калядных песнапеннях у Рэспубліцы Польшча. Прывёз дыплом з міжнароднага фестывалю «Новыя вышыні». А яшчэ школа вырасціла Узорны духавы аркестр, які ў сваім рэпертуары налічвае, можаце сабе ўявіць, каля 60 твораў, — працягвае Людміла Малышчыцкая. – Ён дыпламант абласных свят духавой музыкі і рэспубліканскага конкурсу.

– Але ж парахонец без спорту – не парахонец...

– Святая праўда. Паспяхова працуе свая дзіцяча-юнацкая спартыўная школа з аддзяленнямі футбола і лёгкай атлетыкі, тут актыўна займаецца 240 юнакоў і дзяўчат. З імі працуюць дзесяць трэнераў-выкладчыкаў, палове з якіх прысвоена другая кваліфікацыйная катэгорыя. Зборныя каманды школы даволі ўпэўнена адчуваюць сябе на абласных спаборніцтвах і спартакіядах, ёсць прыклады запрашэння яе членаў у нацыянальныя каманды Рэспублікі Беларусь і заключэння першых прафесійных кантрактаў.

Дадам, што на базе ДЮСШ працуе спартыўна-аздараўленчы лагер.

Край таленавітых людзей

– Наша грамадскае жыццё не было б такое поўнае і насычанае без Парахонскага сельскага цэнтра культуры. Мушу расказваць пра яго шматгранную дзейнасць крышку схематычна, інакш не хопіць ніякага месца, – працягвае прафсаюзны лідар. – Больш за 30 гадоў існуе пры сельскім цэнтры культуры ансамбль народнай песні «Маладзіцы», у якога за гэты час сабраўся сапраўдны музей дыпломаў і грамат, прывезеных з разнастайных мерапрыемстваў раённага і рэгіянальнага маштабу.

Вялікай папулярнасцю сярод працаўнікоў усёй Піншчыны карыстаецца вакальная група «Радуга», у скарбонцы яе дасягненняў ёсць і дыплом рэспубліканскага ўзроўню. А сёлета яны прынялі ўдзел у міжнародным конкурсе ў горадзе Астрог (Украіна).

Штогод харэаграфічны калектыў для дзяцей «Рытм» удала бярэ ўдзел у танцавальным конкурсе Litlle Starts, а харэаграфічны калектыў «Мажарэткі» тры гады запар упрыгожвае праграму Дня Незалежнасці ў пасёлку Лагішын.

Вельмі цікава працуе школа народнай творчасці, куды з задавальненнем прыходзяць дарослыя і дзеці. Яны не проста заняты вышыўкай, а па-мастацку вырабляюць разнастайныя кампазіцыі, упрыгажэнні, сувеніры з этнічнымі цікавінкамі. Некаторыя сталі экспанатамі свайго музея фальклору і быту, створанага дзякуючы намаганням нашых творчых работнікаў і бібліятэкі.

Аматарскія аб'яднанні ДК таксама заслугоўваюць добрага слова. Неаднойчы прымаў на сваіх цікавых святах гасцей з раёна клуб маладой сям'і. А ў клубе тэатральнай ігры «Крынічка» яго члены з задавальненнем дэманструюць немалыя акцёрскія здольнасці.

Я думаю, чытач паверыць мне на слова, што дзякуючы ўсім гэтым вельмі творчым людзям з іскрыстым характарам у нас за апошні час «на вышыні» прайшлі і Калядны фэст з маштабнай тэатралізацыяй, і Дзень абароны дзяцей з любімымі аніматарскімі персанажамі-фіксікамі, і купальскае прадстаўленне з масавым шэсцем да берага нашай ракі Бобрык, і свята аграгарадка з тэатралізаванымі выступленнямі, ды і шматлікія іншыя.

У заключэнне скажу зусім простую рэч: дзе яшчэ вясковы чалавек, якому з-за работы іншым разам і галавы не ўзняць, але не хочацца адставаць ад жыцця, можа палюбавацца на мультымедыйную ўстаноўку, зразумець, што такое аквагрым альбо навучыцца твісцінгу?.. Толькі ў сваім ДК. Невыпадкова наш вясковы цэнтр культуры заносіўся на Дошку гонару Пінскага раёна.

Царква Раства Багародзіцы ў Парахонску. Гаспадарка дапамагае прыхаджанам даглядаць гэты прыгожы старажытны храм. А побач эскіз капліцы ў Колбах, зроблены рукой Блока.

Публікацыю падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ, Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ і Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

УНП 290095025.

P. S. *Астэроіду 2540 астраномы далі імя Аляксандра Блока. У творчай групы «Звязды» прапанова: наступны астэроід, які будзе зафіксаваны навукоўцамі, назваць Парахонск. Мо калі два касмічныя сімвалы і сустрэнуцца.*

Бармен Валерыя САШНЯНІНА і работнік бара Святлана ВЕРХАВЕЦ рыхтуюцца сустракаць наведвальнікаў.